# АРНОЛЬД ЯФІМАВІЧ МІХНЕВІЧ



Споўнілася 70 гадоў доктару філалагічных навук, прафесару, акадэміку Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі Арнольду Яфімавічу Міхневічу. А.Я. Міхневіч - адна з найбольш таленавітых і яркіх постацей у беларускім мовазнаўстве, адзін з карыфеяў нацыянальнай навукі, на ніве якой ён плённа працуе ўжо амаль паўстагоддзя.

Нарадзіўся А.Я. Міхневіч 9 верасня 1936 г. у Мінску ў сям'і ваеннаслужачага. У 1953 г. у Слоніме скончыў сярэднюю школу з залатым медалём. Паступіў у Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя В.П. Чкалава (1952-1958), дзе атрымаў спецыяльнасць «Настаўнік беларускай і рускай моў і літаратур». З 1960 па 1963 г. навучаўся ўаспірантуры Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР па спецыяльнасці «Беларуская мова». У 1993 г. скончыў спецфакультэт (англійская мова) у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

Лёс гэтага вядомага навукоўцы цесна звязаны з Інстытутам мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР (1963-1983), Мінскім інстытутам паліталогіі і сацыяльнага кіравання (1983-1991), Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам (1991-1995), Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры (1995-2001), Прыватным інстытутам кіравання і прадпрымальніцтва (з 2002 г.), а таксама з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, дзе ён працуе прафесарам кафедры сучаснай беларускай мовы (з 2001 г.).

Навуковая дзейнасць А.Я. Міхневіча вызначаецца маштабнасцю і рознабаковасцю яго інтарэсаў. У 1963 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове (трансфармацыйны аналіз)», а ў 1976 г. - доктарскую дысертацыю «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы». Арнольд Яфімавіч высокакваліфікаваны спецыяліст, асоба ў сферы айчыннай і замежнай лінгвістыкі. Мае каля 600 навуковых прац, у тым ліку больш за 30 кніг (частка ў сааўтарстве) па праблемах беларусістыкі, славістыкі, сацыялінгвістыкі, тэорыі і гісторыі мовазнаўства, педагогікі, культуралогіі: «Праблемы семантычнага сінтаксісу беларускай мовы» (Мн., 1974); «Асноўныя тыпы сінтаксічных амонімаў у беларускай мове» (Мн., 1976); «Сінтаксічная перабудова падпарадкавальных словазлучэнняў у сказе (тэксце)» (Мн., 1978); «Функцыі мовы і маўлення і праблемы беларуска-рускага двухмоўя» (Мн., 1982); «Слова ў яго адносінах да скрытаграматычных катэгорый» (Мн., 1982); «Русско-белорусский разговорник» (Мн., 1991); «Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца: Выбраныя выслоўі народнага песняра» (Мн., 2001); «Говорите правильно: Краткий словарь-справочник» (Мн., 2001); «Нямецка-беларускі размоўнік» (ФРГ, Іена, 2003); «Ораторские арабески» (Мн., 2003); «Алтар стала» (Мн., 2003); «Беларускія народныя казкі. Серыя "Беларусам замежжа"» (Мн., 2004).

А.Я. Міхневіч з'яўляўся членам Міжнароднай камісіі па вывучэнні славянскіх моў пры Міжнародным камітэце славістаў (з 1964 па 2000 г.), удзельнічаў у яе пасяджэннях як на тэрыторыі былога СССР, так і за межамі (Польшча, Балгарыя, Югаславія, Германія, Чэхаславакія). Арнольд Яфімавіч прымаў актыўны ўдзел у даследаваннях, што праводзіліся міжрэспубліканскай групай мовазнаўцаў (пры АН СССР) па сацыялінгвістычнай праблематыцы нацыянальных моў СССР. З 1961 г. ён актыўна ўдзельнічае ў навуковым жыцці лінгвістаў Беларусі ў якасці лектара Усесаюзнага таварыства «Веды», на працягу многіх гадоў выступав на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі па праблемах прамоўніцкага майстэрства.

А.Я. Міхневіч з'яўляецца Выдатнікам народнай адукацыі Беларусі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за фундаментальную працу «Беларуская мова. Энцыклапедыя». Ён узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР (1982), а таксама медалём ВДНГ СССР (1986) за стварэнне «Паралексічнага руска-беларускага слоўніка». У 2001 г. А.Я. Міхневіч уключаны ў «Слоўнік міжнародных біяграфій» Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы (Англія).

Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана і абаронена тры доктарскія і 15 кандыдацкіх дысертацый. Выпускнікі філалагічнага факультэта БДУ з удзячнасцю ўспамінаюць яго цікавыя лекцыі.

Калегі віншуюць шаноўнага прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, далейшых поспехаў і творчага даўгалецця.

***Кафедра сучаснай беларускай мовы***